# СЕКЦИЯ III
# СЛАВЯНСКІЯ МОВЫ І КУЛЬТУРА Ў ПРАСТОРЫ І ЧАСЕ

УДК 821.161.3-14*А.Вярцінскі

## «ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК» ЯК АЎТАПСІХАЛАГІЧНЫ ЛІРЫЧНЫ ГЕРОЙ А. ВЯРЦІНСКАГА

**К. С. Афанасенка**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік А. В. Брадзіхіна

*У артыкуле на матэрыяле паэзіі А. Вярцінскага асэнсоўваюцца адметнасці ўвасаблення вобраза «дзівака-чалавека». Асаблівая ўвага надаецца раскрыццю каштоўнаснай сістэмы лірычнага героя. Адзначаецца, што вершы з такім суб'ектам маюць высокі стыль, адсылкі да хрысціянска-рэлігійнай традыцыі, пераважна прыродную вобразнасць.*

**Ключавыя словы:** аўтапсіхалагічны герой, гуманізм, ода, дзівак, прыродная вобразнасць.

## "THE ECCENTRIC MAN" AS THE AUTOPSYCHOLOGICAL LYRICAL HERO OF A. VERTINSKY

**K. S. Afanasenka**

*Francisk Skorina Gomel State University, Republic of Belarus*

Science supervisor A. V. Bradzikhina

*In the article, the features of the embodiment of the image of the "weird-man" are considered based on the material of A. Vertynsky's poetry. Special attention is paid to revealing the value system of the lyrical hero. It is noted that poems with such a subject have a high style, references to the Christian-religious tradition, mostly natural imagery.*

**Keywords:** autopsychological hero, humanism, ode, eccentric, natural imagery.

Як пісьменніку-гуманісту А. Вярцінскаму ўласціва адычнасць ва ўвасабленні высокіх ідэй. Менавіта такім гучаннем надзяляюцца творы пра вайну, рух часу, чалавека як асобу. І. Гоўзіч так ахарактыразавала творчасць паэта: «Паэтаў гуманізм як асаблівасць светапогляду прывёў да заканамернага ўзнікнення ў лірыцы одаў чалавеку, які ў пагранічных сітуацыях застаецца перш за ўсё асобай, чулай да болю і перажыванняў іншых, нясе і не губляе свой «чалавечы знак», праходзіць выпрабаванне часам на дабрыню («Ода добрым людзям», «Мы напачатку зазналі страху…», «Навагодні тост», «Дзівак-чалавек», «Ода магчымасцям мірнага жыцця, або Штрых да партрэта Васіля Быкава»)» [1, с. 55].

Лірычны герой А. Вярцінскага мае багаты духоўны свет. Гэта трошкі дзівак, трошкі паэт: захапляецца паэзіяй жыцця, радасці і прыгажосці. Менавіта такімі

паўстаюць героі вершаў «Дзівак-чалавек», «Вось-вось растаюць ледзяшы…», «З'яўленне», «Давайце ўражліва глянем…», «Хто ў лес, а хто па дровы» і інш. «Дзівак-чалавек» не можа змірыцца з няпраўдай, хоча годна прайсці свой нялёгкі шлях і не скарыцца перад выпрабаваннямі лёсу. Нягледзячы на няўдачы і расчараванні, гэты герой паўтарае, «Што ёсць дабро на свеце, // што будзе дабро, // што пераможа дабро…» [2, с. 56].

Адзін з ключавых для разумення мастацкай канцэпцыі паэта верш "Дзівак-чалавек" адлюстроўвае свядомасць асобы, здольнай надаць звычайным рэчам асаблівы сэнс:

Дзівак чалавек...
Глядзіць на расінку макавую,
і цэлае сонца бачыць перад сабой.
Дзівак чалавек...
Бярэ звычайную ракавіну
і чуе ў ёй
акіянскі прыбой… [2, с. 56]

Лірычны герой верша адстойвае духоўныя каштоўнасці, якія не залежаць ад штодзённых матэрыяльных патрэб. Вера ў пераможнае свята дабра і справядлівасці працінае ўсю вобразную структуру тэксту, набываючы ў апошніх радках характар маральнага афарызму, сентэнцыі, своеасаблівага запавету нашчадкам: «Дзівак чалавек... // І гэта яго дзівацтва – // ратунак яго, // яго чалавечы знак…» [2, с. 56]. Нягледзячы на дыдактычны характар, твор належыць хутчэй да філасофска-медытатыўнай лірыкі. Лейтматывам верша «Дзівак-чалавек» з'яўляецца пошук прызначэння чалавека і яго месца ў сучасным жыцці, імкненне да ідэалу.

Лірычнага героя верша «З'яўленне» таксама можна аднесці да катэгорыі «дзівакоў». Твор поўніцца вясновым настроем і прадчуваннем кахання, якое абуджаецца разам з усім навакольным светам. Пісьменнік надае гэтай з'яве амаль касмічнае, агульнапланетнае значэнне і тым самым засяроджвае ўвагу на незвычайнасці, «дзіўнасці» і выключнасці самага моцнага чалавечага пачуцця:

З'яўленне зор і сонца ў вышыні.
З'яўленне сокаў з глыбіні карэння.
З'яўленне траў у веснавыя дні...
І вось маё, і вось тваё з'яўленне [3].

Адначасова прыродная вобразнасць дазваляе падкрэсліць зямную прыналежнасць кахання, яго жыццесвярджальны характар і ў той жа час незвычайнасць і магутнасць гэтага пачуцця. Паэт сцвярджае ідэю пра духоўную аснову любові, яе цудадзейнасць і хараство:

Як быццам бы дамовіліся ўсе –
глыбіні цёмныя і залатыя высі, –
як быццам бы сказалі ўсе: "З'явіся!"
І ты з'явілася ва ўсёй красе [3].

Вобразу каханай А. Вярцінскі надае сакральны сэнс, і гэта ў нечым нагадвае рэлігійнае пакланенне. Высокая лексіка верша падобная на тую, якой карыстаўся адзін з самых значных паэтаў эпохі Адраджэння Франчэска Петрарка, спалучаючы ў адным вобразе рысы каханай Лауры і боскай Мадонны. Асобнай увагі заслугоўвае апошняя страфа, у якой тройчы (што з'яўляецца адсылкай на сімвалічную лічбу ў хрысціянскай традыцыі) паўтараецца слова «благаславенне». Гэта дазваляе паэту звязаць зямную прыроду з касмічнай і астральнай: «…благаслаўляў тваё з'яўленне свет, // сусвет благаслаўляў тваё з'яўленне» [3]. Заўважым, што Ф. Петрарка таксама ўжывае такую метафару ў сваіх санетах.

Такім чынам, «дзівак-чалавек» як аўтапсіхалагічны лірычны герой А. Вярцінскага сустракаецца ў даволі вялікай колькасці вершаў, як правіла, адычнага характару. Менавіта «дзівак-чалавек» надае звычайным рэчам асаблівы сэнс. Гэты вобраз рэалізуецца як у філасофскіх, так і ў інтымных вершах паэта. Такія лірычныя тэксты маюць высокі стыль, адсылкі да хрысціянска-рэлігійнай традыцыі, пераважна прыродную вобразнасць.

Літаратура

1. Гоўзіч, І. М Жанравыя пошукі Анатоля Вярцінскага: тэарэтычны аспект / І. М. Гоўзіч // Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI вв. : сб. науч. ст. : в 2 ч. Ч. 2 / редкол.: С. Я. Гончарова-Грабовская (отв. ред.) [и др.]. – Мінск : РИВШ, 2007. – С. 56–61.
2. Вярцінскі, А. Выбраныя творы / А. Вярцінскі. – Мінск : Белар. кнігазбор, 2009. – 528 с.
3. Вярцінскі, А. Святло зямное: выбр. вершы, паэмы. / А. Вярцінскі. – Рэжым доступу: https://coollib.net/b/340629-anatol-vyartsinski-svyatlo-zyamnoe/read. – Дата доступу: 29.03.2024.

УДК 821.161.3′06-313.3

## МАТЫЎ ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ ЯК СРОДАК АСЭНСАВАННЯ ЧАЛАВЕЧАГА ЛЁСУ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ

**М. С. Язерская**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік А. В. Брадзіхіна

*У артыкуле на матэрыяле сучаснай беларускай тэмпаральнай фантастыкі разглядаюцца спосабы ўвасаблення матыву чалавечага лёсу. Аўтар прыходзіць да высновы тры асноўныя канцэпцыі яго разумення пісьменнікамі, якія зводзяцца да фаталізму, «Парадоксу забітага дзядулі», закальцаванасці чалавечага лёсу.*

**Ключавыя словы:** час, хронафантастыка, тэмпаральная фантастыка, матыў чалавечага лёсу, матыў падарожжа ў часе.

## THE MOTIVE OF TIME TRAVEL AS A MEANS OF UNDERSTANDING HUMAN DESTINY IN MODERN BELARUSIAN PROSE

**M. S. Yazerskaya**

*Francisk Skorina Gomel State University, Republic of Belarus*

Science supervisor A. V. Bradzikhina

*The article, based on the material of modern Belarusian temporal fiction, examines ways of embodying the motif of human destiny. The author comes to the conclusion of three main concepts of his understanding by writers, which come down to fatalism, "Paradox of the murdered grandpa", the entanglement of human destiny.*

**Keywords:** time, chronofiction, temporal fiction, motive of human destiny, motive of time travel.

У сучаснай літаратуры прадстаўлена мноства твораў, сюжэт якіх засяроджаны вакол трансцэндэнтальнага падарожжа, што дазваляе адкрыць новыя далягляды, атрымаць веды, дакрануцца да загадкавага і недасягальнага. Калі гэта вандроўка ў часе, то такія тэксты адносяць да хронафантастыкі (ці тэмпаральнай фантастыкі»).